# «ЖЫВЕ ALMA-MATER, СВЯТЫНЯ І ГОНАР...»



*Штандар-харугва БДУ культуры і мастацтваў.*

## СІМВАЛЫ ТВОРЧАСЦІ І НАТХНЕННЯ

30 верасня 1993 года адбылося другое нараджэнне вышэйшай навучальнай установы: Мінскага інстытута культуры — у гэты дзень Пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ён быў пераўтвораны ў Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў. Да таго ж дзень 30 верасня з 2002 года стаў днём сцяга і герба універсітэта.

Як вядома, яшчэ са старажытных часоў кожны універсітэт меў уласную сімволіку, якую з гонарам нёс праз стагоддзі. Сваю сімволіку мелі, да прыкладу, універсітэты Вільні і Кракава, Кёнігсберга і Падуі, Фларэнцыі і Парыжа, Прагі і Оксфарда і г.д. Сімволіка складалася з берла (скіпетр), герба, харугвы, пячаткі, строя і гімна. Сімволіка БДУ культуры і мастацтваў распрацавана беларускім мастаком У. Васюком і зацверджана рашэннем універсітэцкай Вучонай рады ў сакавіку 2002 года. Герб пабудаваны па геральдычных законах і мае колеры, уласцівыя каралеўскай і магнацкай геральдыцы — срэбра і чырвані. На фоне чырвонага сонца выява срэбнай птушкі. Сімволіка герба сягае сваімі каранямі ў глыб стагоддзяў і перадае тагачасныя ўяўленні нашых продкаў. Так, срэбра заўсёды лічылася сімвалам месяца, адвечнасці, чысціні і абярэгам супраць ліхіх сіл, а колер чырвані заўсёды сімвалізаваў сабой жыццядайнае святло. Птушка — сімвал творчасці і натхнення, сімвал свабоднай песні.

Харугва, ці па-іншаму штандар БДУ культуры і мастацтваў уяўляе сабой стылізаваны слуцкі пояс, упрыгожаны махрамі і кутасамі. На харугве размешчаны герб, а срэбрам па срэбры вышыты валошкі ды каласы, сабраныя разам, што ўтварае сабою аб'ёмную кампазіцыю. Універсітэцкая харугва з'яўляецца неад'емным атрыбутам святочных мерапрыемстваў і ўрачыстых працэсій.

У Беларускім дзяржаўным універсітэце культуры і мастацтваў ёсць і ўласны гімн — урачыстая песня «alma-mater» на словы вядомага паэта-песенніка А. Лягчылава і на музыку заслужанага дзеяча мастацтваў Беларусі прафесара Я. Рэутовіча. Урачыстыя словы з гімна: «Жыве alma-mater, святыня і гонар, дзе зорак сапраўдных парад...» гучаць на універсітэцкіх фэстах і святах, імі вітаюць першакурснікаў і развітваюцца з выпускнікамі.

## СТАРОНКІ ГІСТОРЫІ

На месцы сучаснага БДУ культуры і мастацтваў некалі быў некрануты куток прыроды. Яшчэ на пачатку XX стагоддзя сюды прыходзілі дзеці з чыгуначнага пасёлка, каб пакупацца і палавіць карасёў у невялікай сажалцы сярод парослага кустоўем лугу. Па адзін бок сажалкі праходзіла вуліца Маскоўская, якая злучала Брэсцкі вакзал, дзе сёння прыпынак электрычак «Інстытут культуры», з цэнтрам горада, былой Саборнай плошчай — сёння гэта плошча Свабоды. Па Маскоўскай праходзіла конна-чыгуначная дарога, так званая конка, якая была адзіным на той час відам грамадскага транспарту.

Ад сажалкі пачыналіся і іншыя дзве вуліцы: Вакзальная, якая ўпіралася ў Віленскі вакзал, цяпер вакзал Мінск-Пасажырскі, і Суражская, якая ішла ў процілеглы бок уздоўж чыгункі, Брэсцкага вакзала і чыгуначных майстэрняў.

Універсітэцкія інтэрнаты знаходзяцца на Рабкораўскай, былой Сяргееўскай вуліцы, а

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

вуліца Талстога называлася Мала-Георгіеўская, дзе з 1915 года ў доме № 12 жыў пісьменнік Змітрок Бядуля. У 1916 годзе ў яго кватараваў Максім Багдановіч. Цяпер на гэтым месцы ўзвышаецца жылы будынак з медыцынскім цэнтрам «Экамедсервіс», а дом Змітрака Бядулі пасля рэстаўрацыі быў перанесены на Рабкораўскі завулак, дзе сёння філіял Літаратурнага музея Максіма Багдановіча. Недалёка ад гэтага дома знаходзіцца інтэрнат №1 БДУ культуры і мастацтваў.

Тады ж адразу за чыгункай ішлі вуліцы, якія былі забудаваны прыватнымі дамамі чыгуначнікаў. Іх дзеці навучаліся пераважна ў гарадскіх рамесніцкіх вучылішчах, сярод якіх вылучалася чыгуначнае, там дзейнічаў мандалінна-гітарны аркестр пад кіраўніцтвам братоў Струнеўскіх і хор рэгента В. Чарнякоўскага. Трэба сказаць, што навучальная ўстанова па падрыхтоўцы кадраў для нашай культуры і мастацтва паўстала на гэтым месцы невыпадкова. Менавіта тут, у прывакзальным раёне, дзе жылі пераважна чыгуначнікі, былі арганізаваны мужчынскі, жаночы і змяшаны самадзейныя хоры, якімі кіраваў Ф. Серыкаў, і дзе ён выхоўваў папаўненне для царкоўнага хору Прывакзальнай царквы Казанскай іконы Божай Маці. Царква стаяла на месцы сучаснай плошчы Мяснікова, і Ф. Серыкаў працаваў у ёй рэгентам. А пасля рэвалюцыі 1905—1907 гадоў у прывакзальным раёне Мінска быў створаны хор чыгуначных рабочых. Рэпертуар хору складаўся з забароненых для спявання рэвалюцыйных і катаржных песень.

У 30-я гады XX ст. дамы жыхароў паступова наблізіліся да сажалкі, якая неўзабаве была поўнасцю засыпана зямлёй. А ў 1975 годзе на месцы былой сажалкі, сярод прыватных дамкоў, вузкіх вуліц, садоў і гародаў паўстаў сучасны васьміпавярховы будынак. У адпаведнасці з Пастановай Савета Міністраў БССР на базе бібліятэчнага факультэта Мінскага дзяржаўнага педагагічнага інстытута імя А. М. Горкага і аддзялення культурна-асветніцкай работы Беларускага тэатральна-мастацкага інстытута былі створаны Мінскі інстытут культуры. Першым рэктарам быў прызначаны вядомы беларускі драматург Аляксандр Лявонцьевіч Петрашкевіч. Інстытут пачаў рыхтаваць спецыялістаў для сферы культуры і мастацтва: бібліятэкараў, культасветработнікаў, кіраўнікоў мастацкай самадзейнасці.

Міналі гады, навучальная ўстанова інтэнсіўна развівалася: ствараліся новыя факультэты, адкрываліся новыя кафедры, арганізоўваліся мастацкія калектывы, будаваліся інтэрнаты. У пачатку 1990-х гадоў у дзяржаве адбыліся грандыёзныя пераўтварэнні, якія запатрабавалі карэнным чынам змяніць падрыхтоўку кадраў для сферы культуры і мастацтва. Была прапанавана праграма стварэння на базе Мінскага інстытута культуры еўрапейскай вышэйшай навучальнай установы універсітэцкага тыпу, рэктарам якой у 1992 годзе стала Ядвіга Дамінікаўна Грыгаровіч. Разам з педагагічным калектывам яна і пачала рэалізоўваць гэтую праграму.

Сэнс і змест дзейнасці ўстановы мае дакладна акрэсленую нацыянальную накіраванасць. Тут рыхтуюць нацыянальную інтэлігенцыю — спецыялістаў у галіне



*У 1975 г. сярод прыватных пабудоў паўстаў 8-павярховы будынак Мінскага інстытута культуры.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ




*Раён сучаснага размяшчэння БДУ культуры і мастацтваў:*
**1** — галоўны корпус; **2** — другі корпус — Маладзёжны тэатр эстрады; **3** — сталовая; **4** — інтэрнат № 1; **5** — інтэрнат № 2; **6** — чыгуначны прыпынак Інстытут культуры (тут быў Брэсцкі вакзал); **7** — аўтастанцыя Дружная; **8** — чыгуначны вакзал Мінск-Пасажырскі (былы Віленскі вакзал).

культуры і мастацтва, тут іх вучаць захоўваць, прапагандаваць і творча пераасэнсоўваць культурную спадчыну беларускага народа.

## МАГЧЫМАСЦІ І ДАСЯГНЕННІ

Сёння ва універсітэце амаль 5 тысяч студэнтаў, магістрантаў, аспірантаў, слухачоў падрыхтоўчага аддзялення, навучэнцаў факультэта дадатковай адукацыі, якія вучацца па 16 спецыяльнасцях і 53 спецыялізацыях шасці факультэтаў: культуралогіі і сацыякультурнай дзейнасці; традыцыйнай беларускай культуры і сучаснага мастацтва; музычнага мастацтва; інфармацыйна-дакументальных камунікацый; завочнага навучання; павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў.

Факультэт інфармацыйна-дакументальных камунікацый самы старэйшы, ён існуе 60 гадоў і ім падрыхтавана больш за 5 тысяч спецыялістаў, якія працуюць у навуковых, навукова-тэхнічных, спецыяльных, дзіцячых, публічных бібліятэках, кніжным гандлі, інфармацыйных цэнтрах, бібліятэках вышэйшых і сярэдніх навучальных устаноў.

Факультэт культуралогіі і сацыякультурнай дзейнасці прадугледжвае вывучэнне сусветнай і нацыянальнай гісторыі, філасофіі, сусветнай і айчыннай літаратуры, эстэтыкі, логікі, рэлігіі, тэорыі культуры і мастацтва, эканомікі і сацыялогіі культуры, замежных моў. Пасля навучання на гэтым факультэце студэнты змогуць паспяхова весці падрыхтоўчую, арганізацыйную, творчую і прадпрымальніцкую дзейнасць у сферы культуры.

Кафедры факультэта мастацкай творчасці падрыхтавалі не адну тысячу кіраўнікоў самадзейных калектываў народнай, эстраднай і духавой музыкі, шмат хто з іх атрымаў званне народнага.

2003 год стаў наступным крокам па ўдасканаленні дзейнасці універсітэта. Адбылася рэарганізацыя яго структурных падраздзяленняў. У выніку сфарміраваны новы факультэт — факультэт традыцыйнай культуры і сучаснага мастацтва. Тэарэтычнай кафедрай факультэта з'яўляецца кафедра этналогіі і фальклору. Кафедра народнага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва карыстаецца вялікай папулярнасцю сярод абітурыентаў. Адвучыўшыся на гэтым факультэце, яны атрымаюць спецыяльнасць рэжысёра народных абрадаў і святаў, рэжысёра самадзейных тэатральных калектываў, кіраўніка аматарскіх танцавальных калектываў.

На факультэце павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў, які створаны ў 2002 годзе, вядзецца работа па трох асноўных напрамках: перападрыхтоўка (атрыманне новай спецыяльнасці); павышэнне кваліфікацыі; дадатковыя адукацыйныя паслугі насельніцтву.

Факультэт завочнага навучання адыгрывае вялікую ролю ў агульнай сітэме падрых-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

тоўкі спецыялістаў мастацкай творчасці, культуралогіі, бібліятэкараў-бібліёграфаў. У 1996 годзе адкрыты Мазырскі філіял гэтага факультэта для жыхароў рэгіёна, што пацярпелі ад Чарнобыльскай катастрофы.

На дваццаці шасці кафедрах універсітэта вядуць навучальную і навукова-даследчую работу каля 30 прафесараў і дактароў навук, больш за 120 дацэнтаў і кандыдатаў навук. Многія з выкладчыкаў з'яўляюцца лаўрэатамі, дыпламантамі міжнародных і рэспубліканскіх фестываляў, конкурсаў, маюць ганаровыя званні народных і заслужаных.

Вядзецца і дынамічна развіваецца навукова-даследчая, творчая праца студэнтаў. Дзейнічаюць студэнцкія навуковыя аб'яднанні, гурткі, наладжана развітая сістэма студэнцкага самакіравання, працуюць студэнцкі і спартыўны клубы, вучэбна-творчыя лабараторыі і аб'яднанні па інтарэсах, студэнцкі прадзюсерскі цэнтр «Арт-мажор». Выпускаюцца зборнікі студэнцкіх і аспіранцкіх навуковых работ, студэнцкія газеты «Alma papera» і «Дыялог», літаратурныя, музычныя зборнікі і г.д.

Універсітэт з'яўляецца асветніцкім цэнтрам краіны, ён аб'ядноўвае адораных і таленавітых юнакоў і дзяўчат, вядзе вялікую мастацкую і творчую працу. Шматлікія аркестры, харавыя, тэатральна-драматычныя, харэаграфічныя вакальныя і інструментальныя студэнцкія калектывы вядомы па ўсёй Беларусі, яны ладзяць справаздачныя канцэрты, масавыя святы, фальклорныя мерапрыемствы па ўсёй краіне, перш за ўсё ў невялікіх гарадах і пасёлках. Фальклорна-этнаграфічныя калектывы «Валачобнікі», «Талака», «Грамніцы», «Баламуты», ансамблі «Гуды», «Капрычыо», «Туцці», хоры «Віват», «Дабрасвет», «Мара», эстрадна-сімфанічны аркестр «Светач» неаднаразова ўдзельнічалі ў міжнародных фестывалях Расіі, Украіны, Эстоніі, Літвы, Венгрыі, Германіі, Францыі, Балгарыі, Галандыі, Італіі, ЗША, Бельгіі і іншых краінах свету. Удзел у міжнародных фестывалях больш як пяцідзесяці творчых калектываў універсітэта і перамога некаторых з іх павышае аўтарытэт Беларусі за межамі краіны.

## ВЫНІКІ І ЗДАБЫТКІ

За 30 гадоў існавання БДУ культуры і мастацтваў 25 тысяч выпускнікоў атрымалі дыпломы аб заканчэнні гэтай установы і працуюць практычна ў кожным куточку нашай краіны. Прысвяціўшы сваё прафесійнае жыццё распаўсюджванню і аднаўленню беларускай культуры і мастацтва, яны памятаюць, шануюць і славяць сваю alma-mater. У ліку выпускнікоў вядомыя артысты беларускай эстрады, харэаграфічных, тэатральных, аркестравых, вакальных і эстрадных калектываў, лаўрэаты міжнародных фестываляў і конкурсаў, навукоўцы, педагогі, кіраўнікі аматарскіх і прафесійных калектываў, якія носяць ганаровыя званні «народны» і «ўзорны», міністры і супрацоўнікі міністэрстваў і ведамстваў, Нацыянальнай тэлерадыёкампаніі, кіраўнікі буйнейшых устаноў сацыяльна-культурнай сферы і інш.

Дзейнасць універсітэта і яго поспехі не засталіся без увагі дзяржавы. Так, навучальнай установе былі перададзены Маладзёжны тэатр эстрады, Галерэя мастацтваў у Палацы Рэспублікі, памяшканні па вул. Маскоўскай для адкрыцця другога вучэбнага корпуса; створаны навукова-творчыя лабараторыі традыцыйных рамёстваў беларусаў і беларускіх народных музычных інструментаў, студэнцкі эстрадна-сімфанічны аркестр і інш.

Пажадаем жа Беларускаму дзяржаўнаму універсітэту культуры і мастацтваў добрага шляху і творчага плёну ў будучым!

***Падрыхтавала Ірына ЗАНЕЎСКАЯ.***



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ